Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-08-22

# Адвечная еднасць славян

Учора ў канцэртнай зале "Мінск" урачыста адкрыўся XV Міжнародны з'езд славістаў. Цягам гэтага тыдня каля 600 вучоных, якія з'ехаліся ў Мінск з 35 краін свету, будуць абмяркоўваць надзённыя гуманітарныя праблемы славянскага свету, міжславянскага супрацоўніцтва ў розных сферах жыцця і разнастайныя спецыфічныя аспекты славістыкі. Асноўныя навуковыя баталіі ў рамках з'езда разгорнуцца ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і будуць доўжыцца да 26 жніўня. Але не менш важным для ўдзельнікаў гэтага прэстыжнага форуму было проста сустрэцца, пагутарыць адно з адным у кулуарах, зазірнуць адно аднаму ў вочы, акунуцца ў славянскую моўную стыхію і адчуць сэрцам... адвечную еднасць славян. Сваё віншаванне ўдзельнікам і гасцям XV Міжнароднага з'езда славістаў накіраваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

►►► 2 стар.

Мікола Чэмер. Адвечная еднасць славян

# Адвечная еднасць славян



Віншаванне ўдзельнікам і гасцям XV Міжнароднага з'езда славістаў ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі агучыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Радзькоў.



Выступае міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч.

◄◄◄ 1 стар.

Упасланні, якое агучыў на ўрачыстым адкрыцці форуму першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Радзькоў, у прыватнасці, адзначалася: "Славянскі свет — наша агульная духоўная Айчына, якая аб'ядноўвае мільёны людзей. На вучоных-славістаў ускладзена пачэсная місія: берагчы і памнажаць скарбы мудрасці і культуры, садзейнічаць распаўсюджванню ведаў пра славянскія народы".



Падчас урачыстага адкрыцця XV Міжнароднага з'езда славістаў у канцэртнай зале "Мінск".

Звяртаючыся да вучоных-славістаў, беларускі лідар падкрэсліў: "Вы з гонарам выконваеце яе і падтрымліваеце агонь, які запалілі першаасветнікі, святыя Кірыл і Мяфодзій. Сімвалічна, што месцам правядзення юбілейнага форуму абрана Беларусь — сэрца славянскай цывілізацыі, якая ўносіць значны ўклад у захаванне яе каштоўнасцей і ідэалаў. Беларусы берагуць гэтую спадчыну і заўсёды памятаюць, што толькі разуменне ўнікальнасці кожнай нацыі і яе духоўных здабыткаў не дасць братам-славянам страціць сябе ў глабалізаваным свеце". Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што XV Міжнародны з'езд славістаў дапаможа ўсім нам лепш зразумець ролю славянства ў цывілізацыйным працэсе, аб'яднаць намаганні ў вывучэнні і папулярызацыі гісторыі, моў і культур нашых народаў.

Па словах старшыні Міжнароднага і Беларускага камітэтаў славістаў члена-карэспандэнта НАН Беларусі Аляксандра Лукашанца, факт правядзення XV Міжнароднага з'езда славістаў у Рэспубліцы Беларусь можна разглядаць як прызнанне пэўных поспехаў у развіцці нашай краіны наогул і славістыкі ў Беларусі ў прыватнасці. У той жа час А.Лукашанец заўважыў, што сёння славянскае культурна-моўнае асяроддзе сутыкаецца з праблемамі знешняй культурнай экспансіі. У моўнай сферы гэтая экспансія праяўляецца ў так званай інтэрнацыялізацыі, а канкрэтней, у беспрэцэдэнтным ціску на славянскія мовы з боку глабальных моў, што ў пэўнай ступені зніжае ўласныя намінатыўныя магчымасці славянскіх моў і можа прывесці да ніверавання нацыянальных асаблівасцей кожнай славянскай мовы паасобку. Старшыня Міжнароднага камітэта славістаў падкрэсліў, што ў сучасных абставінах падтрымка традыцый славістыкі з'яўляецца асабліва актуальнай. "Мы ўпэўнены, што XV Міжнародны з'езд славістаў дасць новы стымул як для пашырэння славістычных даследаванняў у нашай краіне, так і для прыцягнення ўвагі грамадства да праблем нашага нацыянальнага культурнага жыцця ў XXI стагоддзі", — адзначыў Аляксандр Лукашанец.

У сваю чаргу намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі старшыня арганізацыйнага камітэта XV Міжнароднага з'езда славістаў Уладзімір Гусакоў у сваім выступленні згадаў імёны выдатных беларусаў-славістаў, якія закладвалі падмурак айчыннай славістыкі, — Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Яўхіма Карскага, Пятра Бузука і іншых. "Усцешна, што і сёння беларускія вучоныя-гуманітарыі ўдзельнічаюць у шматлікіх міжнародных славістычных праектах, уносяць значны ўклад у развіццё сусветнай і нацыянальнай славістыкі", — канстатаваў У.Гусакоў.

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў і гасцей XV Міжнароднага з'езда славістаў звярнуліся таксама міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў, архібіскуп Мінска-Магілёўскі мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч, старшыня балгарскага фонду "Славяне" прафесар Захарый Захар'еў, члены Міжнароднага камітэта славістаў Аляксандр Малдаван (Расія) і Герд Генчэль (Германія) і інш. Протаіерэй Георгій Сакалоў зачытаў прывітанне Патрыяршага Экзарха ўсёй Беларусі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта.

Многія выступоўцы асабліва падкрэслівалі, што правядзенне XV Міжнароднага з'езда славістаў шчасліва супала з двума знакавымі бласлаўлёнымі датамі — 1025-годдзя хрышчэння Русі і 1150-годдзя стварэння святымі апосталамі Кірылам і Мяфодзіем славянскай азбукі. У сувязі з гэтым зноў і зноў гучалі імёны і пазнейшых вялікіх асветнікаў-славян — Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Васіля Цяпінскага, Сімяона Полацкага.

Дастаткова нечакана прагучала выступленне нямецкага госця Герда Генчэля, які быццам між іншым спраецыраваў сітуацыю ў славянскім свеце на адну канкрэтную еўрапейскую краіну — Швейцарыю. Спадар Герд заўважыў, што наогул швейцарцы — ветлівыя людзі, і таму з немцамі размаўляюць на стандартнай нямецкай мове. Але затое між сабой нямецкія швейцарцы незалежна ад сацыяльнага статусу і адукацыі гавораць выключна на так званай швай-дойч, спецыфічнай швейцарскай нямецкай, якую зусім не разумеюць немцы. "А раптам і Беларусь калі-небудзь пераўтворыцца ў гэтакую славянскую Швейцарыю? — азадачыў прысутных Герд Генчэль. — Марыць жа не забараняецца! Больш за тое, мары часам здзяйсняюцца вельмі-вельмі нечакана. Успомнім хоць бы тую ж Берлінскую сцяну... Хіба хто мог нават марыць, што яна абрынецца так хутка?".

Несумненна, XV Міжнародны з'езд славістаў падорыць яшчэ нямала такіх вось цікавых паваротаў думкі, момантаў ісціны, захапляльных жывых дыскусій. Самым жа галоўным пасля першага дня работы форуму было адчуванне еднасці — беларусістыкі, русістыкі, паланістыкі, багемістыкі і г.д.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**